Да 65-годдзя Вялікай Перамогі

# СВЯШЧЭННАЙ ПАМЯЦЦЮ АВЕЯНЫЯ ГАДЫ

З тых часоў, як адгрымелі апошнія залпы Вялікай Айчыннай вайны, якая стала суровым выпрабаваннем для ўсяго шматнацыянальнага народа СССР, прайшло 65 гадоў. Воіны і працаўнікі тылу, мужныя партызаны і бясстрашныя падпольшчыкі, старыя, жанчыны і дзеці, не шкадуючы сіл, кавалі Перамогу. Яны адстаялі свабоду і незалежнасць Радзімы, выратавалі свет ад фашызму. Пра неўміручы подзвіг савецкага народа напісана шмат навуковых прац і артыкулаў, успамінаў і мастацкіх твораў, зняты кінафільмы і пастаўлены спектаклі. У апошні час даследчыкам сталі даступнымі многія архівы. Новыя дакументы пашыраюць уяўленне пра вядомыя факты і падзеі ваенных гадоў. Вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў мае вялікае значэнне ў патрыятычным выхаванні маладога пакалення. У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2010, № 3), што выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Свяшчэннай памяццю авеяныя гады: да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» (складальнік Т. В. Наварыч). У яго ўключаны матэрыялы, у якіх знайшлі адлюстраванне ключавыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны пачынаючы з трагічнага 1941-га да пераможнага 1945-га. Змешчаны дакументы, выдадзеныя ў асноўным у 2005–2009 гг. Да 65-годдзя вызвалення Беларусі быў таксама падрыхтаваны бібліяграфічны спіс «Праз полымя вайны» («Новыя кнігі», 2009, № 4, дадатак).

У першым раздзеле спіса «На шляху да Перамогі» асноўны акцэнт робіцца на ключавыя бітвы Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, якія адбываліся на савецка-германскім фронце і прывялі да поўнага і канчатковага разгрому фашызму. Ён складаецца з наступных падраздзелаў: «Абарона Брэсцкай крэпасці», «Баі за Магілёў», «Бітва за Маскву», «Сталінградская бітва», «Курская дуга», «Аперацыя “Баграціён”».

Наступны раздзел «Усё для фронту, усё для Перамогі» знаёміць з публікацыямі, у якіх паказана роля тылу ў забеспячэнні фронту неабходнымі рэсурсамі.

Пра ўклад партызан і падпольшчыкаў у перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі можна прачытаць у кнігах і артыкулах, прадстаўленых у раздзеле «Народная барацьба на акупіраванай тэрыторыі».

Рашаючае значэнне для завяршэння разгрому Германіі мела Берлінская аперацыя, якая стала кульмінацыяй Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Яна завяршылася поўным і канчатковым крахам Трэцяга рэйха, гібеллю палітычных і духоўных лідэраў нацызму, перамогай над фашысцкай Германіяй. Аб падрыхтоўцы і правядзенні Берлінскай аперацыі расказваецца ў матэрыялах раздзела «Сцяг Перамогі над Берлінам».

Вялікая Айчынная вайна доўжылася 1418 дзён і начэй. Кожная яе хвіліна была напоўнена жыццём, смерцю, гераізмам і ахвярнасцю байцоў, ваеннымі і працоўнымі подзвігамі савецкага народа. Дзякуючы высокім маральным якасцям радавых воінаў і палкаводцаў, іх мужнасці і адвазе, адказнасці перад Радзімай і

прафесіяналізму была дасягнута Вялікая Перамога. Сярод герояў Вялікай Айчыннай вайны мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці, сыны і дочкі 70 народаў і нацыянальнасцей СССР. У пераважнай большасці гэта байцы і камандзіры Чырвонай арміі, а таксама партызаны і падпольшчыкі. Заключны раздзел спіса «Салдаты Перамогі» прысвечаны героям Вялікай Айчыннай вайны, якія забяспечылі нашу шчаслівую будучыню. У ім таксама змешчаны матэрыялы аб беларусах і ўраджэнцах Беларусі, што ўнеслі значны ўклад у разгром нацысцкай Германіі.

Прапанаваны намі спіс будзе карысны выкладчыкам агульнаадукацыйных школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, гісторыкам, бібліятэкарам, навучэнцам і студэнтам, а таксама ўсім, хто захапляецца гераічным мінулым краіны.

***Кацярына Варанько,***
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*